**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# КАСПЯРОВІЧ МІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ

**ЛІТАРАТУРАЗНАВЕЦ, МОВАЗНАВЕЦ, КРАЯЗНАВЕЦ**

**22 МАЯ 1900 Г. – 26 СНЕЖНЯ 1937 Г.**

**ФОНД № 429**

**ВОПІС № 1**

**1912–1937, асобн. дак. [1970-я] - 2001 гг.**

**МІНСК 2023**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 429**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ М.І. КАСПЯРОВІЧА | 1 - 3 | 1 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ М.І. КАСПЯРОВІЧА | 4 - 31 | 1 - 4 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ПРА М.І. КАСПЯРОВІЧА І ВЫСТАВЫ "УСІМ ВЯДОМЫ ВАМ МІКОЛА КАСПЯРОВІЧ" ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ | 32 - 43 | 4 - 6 |
| 4 | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 44 - 50 | 6 |
| 5. | СПІС МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ | | |

## Прадмова

**Каспяровіч Мікалай Іванавіч** нарадзіўся 22.05.1900 г. у в. Ізабалёва Ігуменскага павета Мінскай губерніі (цяпер Пухавіцкі раён Мінскай вобласці) у сям'і арандатара. У 1912 г. скончыў Багушэвіцкую царкоўна-прыходскую школу, у 1917 – Ігуменскае вышэйшае пачатковае вучылішча. У 1917 здаў экзамены пры Бабруйскай мужчынскай гімназіі на званне народнага настаўніка і пачаў працаваць у Міраслаўскай школе 1-й ступені. У 1921 скончыў Мінскі інстытут народнай асветы, працаваў школьным інструктарам Наркамасветы БССР. З 1922 г. – школьны інспектар Слуцкага, а з 1924 - Віцебскага акруговага аддзела народнай асветы. У 1923-1930 гг. працаваў вучоным сакратаром Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інстытуце беларускай культуры ў Мінску (потым пры АН БССР) і сакратаром краязнаўчага часопіса "Наш Край". М.І. Каспяровіч разгарнуў актыўную грамадскую, краязнаўчую і літаратурную дзейнасць у Віцебску: выступіў ініцыятарам стварэння Віцебскай філіі "Маладняка" і стаў яе кіраўніком. Пры яго ўдзеле і падтрымцы выйшлі два літаратурныя альманахі філіі "Пачатак" (1926) і "Світанне" (1927), па яго прапанове створана Віцебскае акруговае таварыства краязнаўства, у якім ён выконваў абавязкі вучонага сакратара. 29.06.1930 г. разам з групай вядомых пісьменнікаў і культурных дзеячаў Беларусі быў арыштаваны, абвінавачаны па справе "Саюза вызвалення Беларусі" і высланы ў г.п. Асінкі Кемераўскай вобласці на 5 год (1930-1934). Пасля вызвалення працаваў у Навасібірску, дзе чытаў лекцыі па тэорыі літаратуры ў педінстытуце і выкладаў рускую мову і літаратуру ў тэхнікуме сувязі. 28.08.1937 г. быў паўторна арыштаваны НКУС СССР па Заходне-Сібірскаму краю. Расстраляны 26.12.1937 г. Па першым прыгаворы рэабілітаваны 19.09.1960 г., па другім – 14.02.1958 г.

М.І. Каспяровіч – аўтар прац "Беларуская архітэктура" (1925), "Беларуска-расійскі слоўнічак" (1925), "Віцебскі краёвы слоўнік" (1927), "Беларуская навука да Кастрычніка і пасля яго" (1927), "Вывучэнне культурнага стану краю" (1927) і інш. Пісаў пра гісторыю краязнаўчай працы на Беларусі, яе задачы і методыку, даследваў гісторыю беларускага выяўленчага мастацтва, архітэктуру, графіку: артыкулы "Беларускае малярства ў Польшчы (XIV-XVI ст.)", "Асноўныя моманты гісторыі беларускага дойлідства", "Мінск у графіцы А.М. Тычыны" і інш. Склаў бібліяграфію твораў К. Каганца, ён - укладальнік першага беларускага дапаможніка па беларускай літаратуры "Узоры для літаратурных гурткоў пры "Маладняку" і гурткоў селькораў" (1927) і інш.

Дакументы М.І. Каспяровіча паступілі ў БДАМЛМ ад А.М. Каспяровіча (сына) у 2000 г., Т.І. Каспяровіч (пляменніцы) ў 2008 г. У вопіс увайшлі копіі дакументаў М.І. Каспяровіча, выяўленыя да 100-годдзя з дня яго нараджэння ў БДАМЛМ, НАРБ, Віцебскім абласным архіве і інш. У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі складзены вопіс №1 у колькасці 50 спраў (272 дак.) за 1912-1937 гг., асобныя дакументы за [1970-я гг]-2001 гг.

Вопіс складаецца з 4 раздзелаў.

Першы раздзел «Рукапісы М.І. Каспяровіча» склалі ксеракопіі яго артыкулаў за 1920-1930 гг.: «Карусь Каганец», «Культура беларускай кніжкі», «На Ігуменшчыне», «Першыя крокі школьна-краязнаўчай працы» і інш.; ксеракопіі вокладак кніг «Беларуская архітэктура», «Віцебскі краёвы слоўнік», «Краязнаўства» і інш.

У раздзел «Дакументы да біяграфіі М.І. Каспяровіча» увайшлі: пасведчанні аб заканчэнні Багушэвіцкай аднакласнай царкоўна-прыходскай школы, курса Першай Кастрамской гімназіі; прашэнні аб залічэнні на працу ў адну са школ Ігуменскага павета, аб залічэнні яго студэнтам Мінскага настаўніцкага інстытута; пасведчанні аб заканчэнні Інстытута народнай асветы ў г. Мінску, аб працы школьным інструктарам беларускага аддзела Наркамасветы Беларусі; пратаколы пасяджэнняў сяброў Рады палітыка-педагагічных курсаў, прэзідыума праўлення Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства, калегіі Віцебскага акруговага аддзела народнай адукацыі, прэзідыума Цэнтральнага бюро краязнаўства пры БДУ, Белпедтэхнікуме і інш. (з удзелам М.І. Каспяровіча); анкета М.І. Каспяровіча – сябра з'езду інспектараў сацвыху БССР, пасведчанне аб смерці і інш. Амаль усе дакументы – копіі. (1912-1937).

Раздзел 3 сабраў пісьмы А.М. Каспяровіча (сына) да І.К. Германовіча, Г.В. Запартыка, В.У. Скалабана з біяграфічнымі звесткамі пра бацьку; артыкулы І.К. Германовіча, А.М. Гесь, А.М. Карлюкевіча і інш. пра М.І. Каспяровіча. Да 100-годдзя з дня нараджэння было праведзена выяўленне яго асабістых дакументаў у БДАМЛМ, НАРБ, Дзяржаўных архівах Мінскай і Віцебскай абласцей. У раздзел увайшлі каталог, дакументы выставы «Усім вядомы Вам Мікола Каспяровіч», праведзенай у БДАМЛМ да 100-годдзя М.І. Каспяровіча. Аснову выставы склалі яго дакументы, перададзеныя А.М. Каспяровічам (сынам), а таксама копіі выяўленых дакументаў М.І. Каспяровіча з розных архіваў Беларусі за 1917-1937 гг.

Выяўленчыя дакументы прадстаўлены індывідуальным фатаграфіямі М.І. Каспяровіча, з жонкай Надзеяй Станіславаўнай і сынамі Юрыем і Алесем (1914-1930-я гг).

У канцы вопісу змешчана невялікая колькасць дакументаў братоў М.І. Каспяровіча Іосіфа Іванавіча і Івана Іванавіча, а таксама яго пляменніка Алега Іосіфавіча за 1934-2001гг.

Вядучы архівіст І.А. Евенка
10.10.2023

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
АД 20.10.2023
№ 12

ФОНД № 429
ВОПІС № 1
1912-1937, асобн. дак-ты [1970-я] - 2001 гг.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ М.І. КАСПЯРОВІЧА** | | | | |
| 1 | (псеўд. Някемны Ігуменец). "На Ігуменшчыне".1920. Артыкул.<br>Ксеракопія аўтографа | | 3 | 1 | |
| 2 | "Карусь Каганец", "Культура беларускай кніжкі", "Матывы барацьбы ў творчасці М. Багдановіча", "Першыя крокі школьна-краязнаўчай працы" і інш. Артыкулы. 1926-1930.<br>Рэцэнзія на кнігу С. Юдовіна "Гравюры на дереве". 1928.<br>Ксеракопіі выразак з часопісаў "Маладняк", "Наш Край", "Камуністычнае выхаванне" | | 30 | 18 | |
| 3 | Ксеракопіі вокладак кніг М.І. Каспяровіча "Беларуская архітэктура" (1925), А. Іпэля "Беларускае мастацтва" (пераклад з нямецкай мовы на беларускую М.І. Каспяровіча, З.І. Гарбаўца) (1925), "Віцебскі краёвы слоўніік" (1927), "Краязнаўства" (1929) і інш.<br>На вокладцы кнігі "Беларуская архітэктура" - дароўны надпіс М.В. Мялешку | | 10 | 9 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ М.І. КАСПЯРОВІЧА** | | | | |
| 4 | Пасведчанне М.І. Каспяровіча аб заканчэнні Багушэвіцкай аднакласнай царкоўна-прыходскай школы.<br>Арыгінал, копія | 1912 | 2 | 2 | |
| 5 | Пасведчанне М.І. Каспяровіча аб заканчэнні курса Першай Кастрамской гімназіі (1919), прашэнне ў аддзел народнай адукацыі Ігуменскага павятовага рэўкама аб залічэнні яго на працу ў адну са школ павета (1920), заява з просьбай перавесці яго з Язаўскай у Міраслаўскую школу 1 ступені (1920) і інш. Копіі | 1919-1924 | 12 | 9 | |
| 6 | Рахунак М.І. Каспяровіча рэдакцыі газеты "Беларусь" на выплату ганарару за напісанне артыкулаў пад псеўданімамі "Вольны", "М. Віхр". (1919). Копія | | 1 | 1 | |
| 7 | Прашэнне М.І. Каспяровіча аб залічэнні яго | | 3 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | студэнтам Мінскага настаўніцкага інстытута (1919), паведамленне ў Ігуменскі павятовы аддзел народнай адукацыі аб вяртанні з беларускіх курсаў у Міраслаўскую школу  і з просьбай аб медыцынскай дапамозе (1921). Копіі | | | | |
| 8 | Заява М.І. Касяровіча ў Беларускі нацыянальны камітэт на прызначэнне яго інструктарам Ігуменскага павету (1920), пасведчанне аб працы там школьным работнікам з 1 верасня 1917 г. па 1 верасня 1921 г. (1921) і інш. | | 7 | 4 | |
| 9 | Пасведчанне М.І. Касяровіча аб заканчэнні Інстытута народнай асветы ў г. Мінску | 1921 | 2 | 2 | |
| 10 | Пасведчанне М.І. Касяровіча аб працы школьным інструктарам беларускага аддзела Наркамасветы Беларусі | 1921 | 1 | 1 | |
| 11 | Дакументы Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасці (М.І. Касяровіч - член таварыства): спісы, справаздача аб дзейнасці. 1921-1922. Копіі | | 12 | 3 | |
| 12 | Пратакол пасяджэння сяброў Рады палітыка-педагагічных курсаў (М.І. Касяровіч - удзельнік Рады).1923. Копія | | 2 | 1 | |
| 13 | Фармулярны спіс аб службе М.І. Касяровіча  - інспектара сацвыхавання Слуцкага павятовага аддзела народнай адукацыі (1923), пасведчанне аб накіраванні яго на Вышэйшыя Мінскія педагагічныя курсы (1923) і інш. Копіі | | 12 | 4 | |
| 14 | Кароткая аўтабіяграфія М.І. Касяровіча. 1924. Копія. Аўтограф | | 2 | 1 | |
| 15 | Спісы слухачоў Вышэйшых курсаў Беларусазнаўства (у т.л. М.І. Касяровіч) з адзнакамі ведаў па беларускай мове, палітэканоміі і матэрыялізму, геаграфіі і інш., лекцыйная кніжка на імя М.І. Касяровіча, пасведчанне аб заканчэнні курсаў. 1924. Копіі | | 30 | 9 | |
| 16 | Спісы "былых сяброў Беларускай партыі сацыялістаў - рэвалюцыянераў, прысутных 8-9 чэрвеня 1924 г. у г. Менску" (у т.л. М.І. Касяровіч). Копіі | | 6 | 3 | |
| 17 | Даведкі У.М. Ігнатоўскага аб накіраванні М.І. Касяровіча ў Віцебскі аддзел народнай адукацыі | | 5 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | [1924], выпіска з загаду Народнага камісарыяту асветы БССР аб пераводзе яго на працу ў Інстытут беларускай культуры (1926) і інш. Копіі | | | | |
| 18 | Спіс заснавальнікаў Віцебскага таварыства краязнаўства, пратаколы пасяджэнняў з рэзалюцыямі М.І. Каспяровіча і інш. 1924-1926. Копіі | | 13 | 8 | |
| 19 | Дакументы М.І. Каспяровіча - удзельніка таварыства "Маладняк": спісы сяброў Віцебскай філіі, пратаколы пасяджэнняў, даклад Першай акруговай канферэнцыі "Маладняка" - выразка з газеты, пісьмо ў ЦБ "Маладняка" аб стане выдавецкай справы і інш. 1924-1927. Копіі | | 19 | 13 | |
| 20 | Пратакол пасяджэння прэзідыума праўлення Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства са справаздачай вучонага сакратара таварыства М.І. Каспяровіча. 26 сакавіка 1926 г. Копія | | 2 | 1 | |
| 21 | Пісьмы М.І. Каспяровіча ў Цэнтральнае бюро краязнаўства з прапановай збіраць матэрыялы па гісторыі краязнаўства (10 красавіка 1926 г.), з паведамленнем пра абмеркаванне "Віцебскага краёвага слоўніка" (23 чэрвеня 1926 г.), М.Я. Богдану з падзякай за звесткі пра К. Каганца (5 кастрычніка 1928 г.) і інш. Копіі | | 4 | 4 | |
| 22 | Пратаколы пасяджэнняў калегіі Віцебскага акруговага аддзела народнай адукацыі з удзелам М.І. Каспяровіча. 1926. Копіі | | 6 | 2 | |
| 23 | Анкета М.І. Каспяровіча - сябра з'езду інспектараў сацвыху БССР. 1927. Копія | | 2 | 1 | |
| 24 | Статут Усебеларускага таварыства бібліяфілаў, пратакол першага арганізацыйнага сходу сяброў таварыства з удзелам М.І. Каспяровіча. 1927. Копіі | | 8 | 2 | |
| 25 | Рэкамендацыі М.І. Каспяровіча па вывучэнні і даследванні народнай мовы, збудаванняў, жылля, аддзення жыхароў Віцебшчыны (1925), пісьмо Віцэ-прэзідэнта Інбелкульта ў Дзяржаўную бібліятэку з просьбай дазволіць М.І. Каспяровічу карыстацца літаратурай для напісання працы пра К. Каганца і інш. (1928). Копіі | | 6 | 6 | |
| 26 | Паштоўка ў Інбелкульт М.І. Каспяровічу з просьбай даслаць маршрут і план работы экспедыцыі па Беларусі. 1928. Копія | | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 27 | Пратаколы пасяджэнняў прэзідыума Цэнтральнага бюро краязнаўства пры БДУ, Белпедтэхнікуме, зварот ЦКБ і Беларускага дзяржаўнага музея ў Народны камісарыят асветы з просьбай утварэння інстытуту практыкантаў-музеязнаўцаў у Беларускім дзяржаўным музеі і інш. 1926-1928. Копіі | | 16 | 9 | |
| 28 | Пасведчанне М.І. Каспяровіча - карэспандэнта часопіса "Наш Край" (1929), спіс навуковых супрацоўнікаў Беларускай акадэміі навук (у т.л. М.І. Каспяровіч) [1929]. Копіі | | 2 | 2 | |
| 29 | Ваенны білет М.І. Каспяровіча | 1929 | 4 | 1 | |
| 30 | Выпіскі з пратаколаў допытаў І.І. Краскоўскага, В.Ю. Ластоўскага са звесткамі пра М.І. Каспяровіча. Пратакол сакрэтнага пасяджэння фракцыі Прэзідыума Беларускай акадэміі навук аб зняцці з пасад па справе "Саюза вызвалення Беларусі" (у т.л. М.І. Каспяровіча) і інш. 1930. Копіі | | 11 | 4 | |
| 31 | Пасведчанне аб смерці М.І. Каспяровіча 26.12.1937 г. Копія | | 1 | 1 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ПРА М.І. КАСПЯРОВІЧА І ВЫСТАВЫ "УСІМ ВЯДОМЫ ВАМ МІКОЛА КАСПЯРОВІЧ" ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ** | | | | |
| 32 | Пісьмо А.М. Каспяровіча (сына) да І.К. Германовіча са звесткамі пра бацьку.<br>Ксеракопія | 1971 | 5 | 1 | |
| 33 | Пісьмо А.М. Каспяровіча (сына) Г.В. Запартыка, В.У. Скалабану з біяграфічнымі звесткамі пра бацьку.<br>Прыкладзены пералік дасланых дакументаў | 2000 | 11 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 34 | І.К. Германовіч. "Жыццё праляцела знічкай".<br>А.М. Гесь. "Каспяровіч на Случчыне".<br>А.М. Карлюкевіч. "У Ізабалёва, на радзіму Міколы Каспяровіча" і інш. Артыкулы.<br>Г. і Ш. Агляд артыкулаў у часопісе "Наш Край" (№1-3, 1928) , у т.л. напісаных М.І. Каспяровічам.<br>Выразкі з газет, ксеракопіі выразак з газет і часопіса "Росквіт" | 1980-2000 | 13 | 8 | |
| | * * * | | | | |
| 35 | Пералікі дакументаў пра М.І. Каспяровіча, выяўленых у БДАМЛМ, НАРБ, Дзяржаўных архівах | 2000 | 32 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Мінскай і Віцебскай абласцей да 100-годдзя з дня нараджэння | | | | |
| | * * * | | | | |
| 36 | Каталог выставы БДАМЛМ "Усім вядомы Мікола Касяровіч" да 100-годдзя з дня нараджэння. (кіраўнік - В.У. Скалабан). Машынапіс з праўкай В.У. Скалабана | 2000 | 13 | 1 | |
| 37 | Выстава "Усім вядомы Вам Мікола Касяровіч": фатаграфія М.І. Касяровіча [1920-я] - копія, кароткія звесткі пра яго, ксеракопіі вокладак кніг "Беларуская архітэктура" (1925), "Віцебскі краёвы слоўнік" (1927), "Краязнаўства" (1929), вокладка часопіса "Наш Край" (1926) і інш. | 2000 | 12 | 12 | |
| 38 | Выстава "Усім вядомы Вам Мікола Касяровіч" ("Ігуменшчына" 1917-1921): спісы беларускага актыву (1917), удзельнікаў культурна-прасветнай секцыі Усебеларускага з'езда (1917), заява ў аддзел народнай адукацыі Ігуменскага павятовага рэўкама з просьбай перавесці з Язаўскай у Міраслаўскую школу (1920) і інш. Копіі | 2000 | 12 | 10 | |
| 39 | Выстава "Усім вядомы Вам Мікола Касяровіч" ("Слуцк" 1922-1924): справаздача М.І. Касяровіча - інспектара сацвыху Слуцкага павету за першае паўгоддзе 1922-1923 гг. (1923), пратакол пасяджэння сяброў Рады палітыка-педагагічных курсаў (у т.л. М.І. Касяровіч) (1923) і інш. Копіі | 2000 | 10 | 9 | |
| 40 | Выстава "Усім вядомы Вам Мікола Касяровіч" ("Віцебск" 1924-1926): спіс заснавальнікаў Віцебскага таварыства краязнаўства (у т.л. М.І. Касяровіч) (1924), справаздачны даклад аб працы Віцебскай філіі "Маладняка" на Першай акруговай канферэнцыі (1925), даклад М.І. Касяровіча "Светазнаўства і краязнаўства" на Віцебскім акруговым краязнаўчым сходзе (1925) і інш. Копіі | 2000 | 16 | 13 | |
| 41 | Выстава "Усім вядомы Вам Мікола Касяровіч" ("Мінск" 1926-1930): пратаколы пасяджэнняў Цэнтральнага бюро краязнаўства (1926), пратакол пасяджэння першага арганізацыйнага сходу сяброў таварыства бібліяфілаў (1927) і інш. Копіі | 2000 | 23 | 20 | |
| 42 | Выстава "Усім вядомы вам Мікола Касяровіч" ("Мінск" 1930, "Навасібірск" 1934-1937): пратакол сакрэтнага пасяджэння камуністычнай фракцыі Прэзідыума Беларускай акадэміі навук аб зняцці з | 2000 | 11 | 9 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | пасады супрацоўнікаў (у т.л. М.І. Каспяровіча) (1930), фатаграфіі М.І. Каспяровіча з жонкай і сынамі (1936), пасведчанне аб смерці (1937) і інш. Копіі | | | | |
| 43 | Выстава "Усім вядомы Вам Мікола Каспяровіч": экслібрысы М.І. Каспяровіча мастакоў Я.С. Мініна, А.М. Тычыны (1926,1928), артыкулы І.К. Германовіча, К. Лешніцы і інш. пра яго. Копіі | 2000 | 12 | 10 | |
| | **4 ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 44 | Фатаграфіі М.І. Каспяровіча, індывідуальныя | 1914-1936 | 9 | 9 | |
| 45 | Фатаграфіі М.І. Каспяровіча з жонкай Надзеяй Станіславаўнай і сынамі Юрыем і Алесем | [1930-я гг] | 3 | 3 | |
| 46 | Фатаграфія дома ў г. Мінску, дзе жыў М.І. Каспяровіч з сям'ёй | [1920-я гг] | 1 | 1 | |
| 47 | [З.І. Азгур]. Фатаграфія барэльефа М.І. Каспяровіча. Ксеракопія. [1929] | | 2 | 2 | |
| | *  *  * | | | | |
| 48 | Дакументы Іосіфа Іванавіча Каспяровіча (брата): фатаграфіі І.І. Каспяровіча, Н.К. Каспяровіч (жонкі), індывідуальныя; атэстат на званне настаўніка пачатковай школы (1938), пасведчанні аб узнагародах і інш. Арыгіналы, копіі | 1934-[1970-я гг] | 13 | 11 | |
| 49 | Фатаграфіі Івана Іванавіча Каспяровіча (брата), індывідуальныя і з сынам Анатолем | [1930-я-1989 гг] | 4 | 4 | |
| 50 | Дакументы А.І. Каспяровіча (сына Іосіфа Іванавіча Каспяровіча, пляменніка): улётка А.І. Каспяровіча - кандыдата ў дэпутаты Саянагорскага гарадскога Савета, адказы КДБ Беларускай ССР на запыты пра дзядзьку М.І. Каспяровіча | 1991-2001 | 12 | 8 | |

У дадзены вопіс унесена 50 (пяцьдзесят)

спраў з № 1 па № 50 , 272 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

вяд. архівіст ______________________ І.А. Евенка

18.10.2023

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння ______________________ В.І. Бярэйшык

захаванасці дакументаў ______________________

"_____"____________20____ г.